# ПАЛІТЫЧНЫ ДЫСКУРС ЯК АКТУАЛЬНЫ НАВУКОВЫ НАПРАМАК

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У сучаснай інфармацыйнай прасторы па аб'ектыўных прычынах ўзрастае роля палітычнага дыскурсу. Сёння гэта не проста спосаб камунікацыі, а асобная сэнсавая прастора, якая фарміруецца і развіваецца па ўласных законах. У артыкуле прапануецца агляд некаторых навуковых падыходаў да даследавання палітычнай камунікацыі ў розных сферах сацыяльна-гуманітарных ведаў.

***Ключавыя словы:*** палітычны дыскурс; камунікацыя; лінгвістыка; моўная дзейнасць; медыядыскурс; палітыка.

# ПОЛИТИЧЕСКИЙ ДИСКУРС КАК АКТУАЛЬНОЕ НАУЧНОЕ НАПРАВЛЕНИЕ

***Н. А. Зубчёнок***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

В современном информационном пространстве по объективным причинам возрастает роль политического дискурса. Сегодня это не просто способ коммуникации, а отдельное смысловое пространство, которое формируется и развивается по собственным законам. В статье предлагается обзор некоторых научных подходов к исследованию политической коммуникации в различных сферах социально-гуманитарного знания.

***Ключевые слова:*** политический дискурс; коммуникация; лингвистика; языковая деятельность; медиадискурс; политика.

Катэгорыя дыскурсу выкарыстоўваецца сёння вельмі актыўна ў сферы такіх навуковых дысцыплін, як лінгвістыка, паліталогія, філасофія, псіхалогія, сацыялогія і інш. Вызначаюць дыскурс палітычны, сацы-

яльны, культуралагічны і інш. У кожнай сферы даследчыкі прапануюць свае азначэнні, у аснове якіх уласцівасці пэўнага тыпу камунікацыі.

Традыцыйна вывучэнне розных відаў дыскурсу адбываецца ў межах лінгвістычнай навукі. Тут жа выпрацаваны яго тэрміналагічны апарат. У апошні час можна канстатаваць павышэнне цікавасці навукоўцаў да пытанняў дыскурсу прадстаўнікоў розных сацыяльных груп і, безумоўна, палітыкаў. У дадзенай сферы мова выступае ў якасці рэсурсу, з дапамогай якога ажыццяўляецца інфармаванне грамадства, уздзеянне на яго, абмеркаванне заканадаўчых актаў і інш.

Агульнапрынятага азначэння палітычнага дыскусу пакуль не існуе, а сам тэрмін «дыскус» выкарыстоўваецца для назвы розных відаў моўнай дзейнасці. Так, вядомы галандскі даследчык Т. ван Дэйк да палітычнага дыскурсу адносіў асобны клас жанраў, абмежаваных пэўнай сацыяльнай сферай, сферай палітыкі [1]. Палітычны дыскурс у даследаваннях разглядаецца сёння не толькі як камунікацыя палітыкаў (Т. ван Дэйк, Е. І. Шэйгал), але і як самастойны навуковы напрамак (Рут Водак). Акрамя таго, у дадзеным кантэксце ўжываюцца паняцці «грамадска–палітычная мова», «агітацыйна-палітычная мова», «мова грамадскай думкі», «палітычная мова». Значны ўклад у вывучэнне тэорыі і практыкі палітычнага дыскурсу ўнеслі такія расійскія лінгвісты, як Э. У. Будаеў, А. П. Чудзінаў, Е. І. Шэйгал і інш. У працах гэтых даследчыкаў яго асаблівасці вызначаюцца, напрыклад, праз спецыфіку моўнай асобы (антрапацэнтрызм); пашырэнне праблемнага моўнага поля сумежнымі (экспансіянізм); вывучэннем мовы ў працэсе дзеяння, развіцця (функцыяналізм); праз апісанне і тлумачэнне моўных з’яў і працэсаў (эксгіланатарнасць) [2]. Навукоўцы падкрэсліваюць, што спецыфіка палітыкі, у адроненні ад іншых напрамкаў чалавечай дзейнасці, як раз і заключаецца ў яе пераважна дыскурсіўным характары. Так, існуе меркаванне, што палітычную дзейнасць можна атаясамліваць з моўнай. У сучаснай паліталогіі назіраюцца спробы разглядаць моўны працэс не як сродак адлюстравання палітычнай рэальнасці, а як кампанент асобнага палітычнага поля [3].

Пры лінгвістычным аналізе ў дачыненні да палітычнага дыскурсу вялікае значэнне маюць форма, задачы і змест камунікатыўнага акту, а таксама лексіка. Палітычны дыскурс істотна адрозніваецца ад звычайнай мовы. Яму ўласцівы наступныя адзнакі: тэрміналагічнасць палітычнай лексікі; спецыфічная структура дыскурсу (выкарыстанне асаблівых моўных прыёмаў); спецыфічная рэалізацыя (пісьмовае альбо гукавое афармленне). Функцыя ўздзеяння мовы ў палітычным дыскурсе

рэалізуецца праз выкарыстанне пэўных моўных стратэгій, «сукупнасць моўных дзеянняў» [4].

У межах даследавання палітычнага дыскурсу вядзецца вывучэнне форм і зместу тэкстаў адпаведнай скіраванасці, моўных стратэгій і тактык палітычнай камунікацыі. Напрыклад, у залежнасці ад тэматычна-зместавага напаўнення палітычны дыскурс падзяляюць на інстытуцыянальна-палітычны, масмедыйны, агульнаўжывальны [2]. Вызначаюцца функцыі палітычнага дыскурсу: камунікатыўная, пабуджальная (апелятыўная, вакатыўная, канатыўная, рэгулятыўная, інструментальная), эматыўная, метамоўная, фактычная і інш. Важнае значэнне ў палітычнай камунікацыі належыць экспрэсіўным сродкам (напр., агрэсіі), рытарычным прыёмам. Ужыванню асобных моўных адзінак, стылістычным асаблівасцям (лінгвістычным, экстралінгвістычным, граматычным) надаецца асобная ўвага. Вывучаецца ідэалагічны аспект палітычнай камунікацыі.

Мэты палітычнай камунікацыі абумоўліваюць яе асаблівасці. Такім чынам, камунікатыўная функцыя палітычнага дыскурсу накіравана на перадачу інфармацыі з мэтай уздзеяння на свядомасць адрасата, змены карціны палітычнага свету.

Асновай даследавання мовы палітыкі, безумоўна, з'яўляецца медыядыскурс (інфармацыйныя рэсурсы друкаваных і інтэрнэт-выданняў, радыё і тэлебачання). Гэта палітычныя матэрыялы, розныя формы выступленняў, дакументы і інш.

Такім чынам, палітычны дыскурс – гэта асаблівая з'ява, якая мае вялікае значэнне ў жыцці сучаснага грамадства. У якасці навуковага паняцця – гэта даволі складаны аб'ект даследавання. Вучоныя падкрэсліваюць міждысцыплінарны характар дадзенай катэгорыі, паколькі яе задачы ўпісваюцца як у сферу лінгвістыкі, так і ў сферу іншых грамадскіх навук. У той жа час можна канстатаваць, што цікавасць да вывучэння дадзенага пытання толькі ўзрастае.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Тён А. ван Дейк.* Дискурс и власть: Репрезентация доминирования в языке и коммуникации. Пер. с англ. М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2013. 344 с.
2. *Паршина О. Н.* Российская политическая речь: Теория и практика. М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2012. 232 с.
3. *Будаев Э. В., Чудинов А. П.* Современная политическая лингвистика. Екатеринбург: Урал, 2011. 252 с.
4. *Шейгал Е. И.* Семиотика политического дискурса. М., 2004. 368 с.